*Шкляр Г. З.* **Избранные труды. Языковое наследие** / Г. З. Шкляр ; сост. В. Н. Курцова [и др.] ; науч. ред.: В. Н. Курцова, Н. С. Ганцовская. Минск : Беларус. навука, 2020. 259 с.

*Шкляр Г. З.* **Выбраныя працы. Моўная спадчына** / Г. З. Шкляр ; уклад. В. М. Курцова [і інш.] ; навук. рэд.: В. М. Курцова, Н. С. Ганцоўская. Мінск : Беларус. навука, 2020. 259 с.

*Shklyar H.* **Selected works. Linguistic heritage** / H. Shklyar ; compil. V. M. Kurcova [et al.] ; eds.: V. M. Kurcova, N. S. Gantsovskaya. Minsk : Belaruskaja navuka, 2020. 259 p. (in Belarus.)[1].

Рэцэнзаваную кнігу ў рамках сумеснага беларуска-расійскага праекта ўклалі супрацоўнікі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі В. Курцова, І. Капылоў і выкладчыкі Кастрамскога дзяржаўнага ўніверсітэта Н. Ганцоўская і Г. Няганава.

Выданне гэтага тома з'яўляецца значнай падзеяй у даследаванні гісторыі беларускай лінгвістыкі, паколькі Г. Шкляр – першы беларускі мовазнаўца з ліку тых, хто працаваў у 1930-я гг., выбраныя творы якога выйшлі асобнай кнігай. На фоне багатай і яркай лінгвістыкі 1920-х гг. беларускае мовазнаўства наступнага дзесяцігоддзя, асабліва другой яго паловы, прыцягнула менш увагі гісторыкаў навукі. Беларускія мовазнаўцы гэтага часу – так распарадзілася гісторыя – пераважна не змаглі пакінуць яркага следу ў навуцы. Іх дзейнасць трапіла на перыяд, калі маладым вучоным даводзілася не толькі (і не столькі) спасцігаць азы навуковай творчасці, але і пераадольваць складаны грамадска-палітычны «матэрыял» сваёй эпохі. Калі мець на ўвазе пашыраныя ў 1930-я гг. магчымасці для прадстаўнікоў ніжэйшых сацыяльных слаёў здабываць раней элітарны статус вучоных, то на ўзроўні канкрэтных чалавечых лёсаў гэты «матэрыял», натуральна, мог спрыяць навуковым здзяйсненням. На працягу 1930-х гг. у Беларусі навуковыя кадры папоўніліся за кошт шматлікіх «вылучэнцаў». Але ў сукупнасці кантэкст эпохі хутчэй спрыяў рэгрэсу ў развіцці лінгвістыкі. З нагоды рэалій 1930-х гг. В. Курцова ўжывае выраз «час тэрору», прымяняльна да кампаніі «барацьбы з касмапалітамі» канца 1940-х гг. піша пра «вынішчэнне лепшых, таленавітых прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці» (с. 6). Як гэта: займацца лінгвістыкай у час тэрору і быць яўрэем падчас ганенняў на яўрэяў? Кніга можа даць адказы і на такія пытанні.

Зборнік складаецца з чатырох частак. Першая (с. 12–48) прысвечана акалічнасцям біяграфіі героя. У другой частцы (с. 49–139) надрукаваны напісаныя Г. Шклярам раздзелы калектыўных падручнікаў «Сінтаксіс беларускай мовы» (1939) і «Курс сучаснай беларускай мовы. (Фанетыка, марфалогія, лексіка)» (1940), а таксама ўзноўленыя ў фотакопіях асобныя старонкі апублікаванага ў 1940 г. (фактычна ў 1941 г.) «Ідыш-рускага слоўніка» Г. Шкляра і С. Рохкінд. У трэцяй частцы (с. 140–216) змешчаны напісаныя ў кастрамскі перыяд русістычныя працы Г. Шкляра, а таксама артыкул аб клічнай форме ў беларускай мове. У чацвёртую частку (с. 217–248) уключаны неапублікаваная праца 1953 г. «Беларуска-польскія слоўнікавыя адносіны (да пытання аб моўнай роднасці славянскіх нацый)» з двума дадаткамі («Слоўнікавы склад мовы паэмы Я. Купалы "Над ракой Арэсай"» і «Слоўнікавы склад мовы аповесці Я. Коласа "Дрыгва"») і раздзел «Літаратура і крыніцы».

З прычыны ранейшага недахопу біяграфічных звестак пра Г. Шкляра больш за ўсё прыцягвае ўвагу першая частка. Мінскі перыяд біяграфіі героя кнігі выкладзены ў прадмове і артыкуле В. Курцовай «Г. З. Шкляр праз люстэрка архіўных дакументаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (с. 5–33), кастрамскі – у артыкуле Н. Ганцоўскай «Герцэль Залманавіч Шкляр як настаўнік і навуковец: Кастрамскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Н. А. Някрасава» (с. 33–36). На с. 38–48 змешчаны падрыхтаваныя кастрамічом У. Смарчковым выпіскі з асабовай справы Г. Шкляра.

Кароткі летапіс жыцця і дзейнасці Г. Шкляра на аснове першай часткі кнігі выглядае наступным чынам. Даты жыцця і смерці: 1904–1966 гг. Вучыўся на педагагічным факультэце («пэдфаку») Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1926–1930 гг. З канца 1930 г. працаваў у Беларускай акадэміі навук, займаўся ідыш, апублікаваў шэраг артыкулаў. Удзельнічаў у падрыхтоўцы «Тлумачальнага слоўніка ідыш». У 1940 г. у суаўтарстве з С. Рохкінд надрукаваў «Ідыш-рускі слоўнік». Выкладаў у Беларускім педагагічным інстытуце і Беларускім дзяржаўным універсітэце. У канцы 1930-х гг. стаў займацца пераважна беларусістыкай, удзельнічаў у напісанні двух падручнікаў і падрыхтоўцы беларуска-рускага слоўніка. У 1941 г. быў эвакуіраваны ў Кастраму, дзе амаль да апошніх дзён жыцця працаваў у Кастрамскім педагагічным інстытуце. Выкладаў рускую мову, вывучаў мясцовыя гаворкі, працягваў займацца беларусістыкай. У канцы 1930-х – канцы 1940-х гг. падрыхтаваў дзве дысертацыі, але не абараніў іх.

Дзякуючы публікацыі 2009 г. Д. Шавялёва (у рэцэнзаваным зборніку не згадваецца) раней былі вядомыя дата нараджэння Г. Шкляра, інфармацыя аб атрыманай адукацыі і часе паступлення на работу ў Беларускую акадэмію навук. У характарыстыцы

[1]Аўтар лічыць прыемным абавязкам выказаць падзяку Вольфу Рубінчыку і Віталю Зайку за кансультацыі ў галіне ідышыстыкі. Любыя памылковыя сцверджанні, якія могуць быць у тэксце, просьба адносіць да выказванняў аўтара рэцэнзіі.


CC BY NC

Г. Шкляра 1936 г. напісана: «…дае дабраякасную прадукцыю з перавыкананнем плана, ударнік»[2]. У рэцэнзаваным выданні прыведзена намнога больш біяграфічнай інфармацыі, пацверджанай архіўнымі дакументамі, у кнізе апублікаваны фотакопіі некаторых дакументаў – і гэта вялікае дасягненне.

У падрыхтаваных У. Смарчковым выпісках з асабовай справы надрукаваны ліст героя кнігі дырэктару Кастрамскога настаўніцкага інстытута ад 19 ліпеня 1941 г., тры аўтабіяграфіі, два спісы навуковых прац, пастанова вучонага савета Кастрамскога настаўніцкага інстытута ад 13 лютага 1948 г. аб прадстаўленні Г. Шкляра да зацвярджэння ў вучоным званні дацэнта, выпіска з загада аб яго прызначэнні выконваючым абавязкі загадчыка кафедры рускай мовы Кастрамскога настаўніцкага інстытута, выпіска з характарыстыкі, ліст прафесара А. Міртава ад 3 лютага 1948 г. дырэктару Кастрамскога настаўніцкага інстытута аб даследаванні Г. Шкляра «Лексічныя польскія элементы ў сучаснай беларускай мове» і інш. Найранейшы з гэтых дакументаў, тэлеграма ў Кастрамскі настаўніцкі інстытут з запытам аб магчымасці атрымаць работу, датуецца пачаткам ліпеня 1941 г. Пра мінскі перыяд жыцця і дзейнасці героя кнігі з гэтых выпісак можна меркаваць па дакументах, падрыхтаваных самім Г. Шклярам: па лісце дырэктару Кастрамскога настаўніцкага інстытута (1941), складзеных у 1945–1948 гг. аўтабіяграфіях, спісах навуковых прац і інш.

Цікавымі ў біяграфіі Г. Шкляра могуць быць некалькі сюжэтаў. Сярод іх – ідышыстыка, удзел героя кнігі ў 1930–40-я гг. у распрацоўцы беларускай лексікаграфіі, рэпертуар навуковых прац даследчыка, заняткі беларусістыкай у Кастраме, русістыка, акалічнасці, звязаныя з захадамі пацвердзіць навуковую кваліфікацыю, і інш. Такія напрамкі, як ідышыстыка і беларуская лексікаграфія канца 1930-х – пачатку 1940-х гг., належаць да найменш распрацаваных фрагментаў гісторыі беларускага даваеннага мовазнаўства. Таму публікацыя выбраных прац Г. Шкляра не проста з'яўляецца чарговым выданнем мовазнаўчай спадчыны нейкага навукоўца, а патрапляе ў фокус патрэб сучаснай гісторыі беларускай лінгвістыкі, робіць уклад у запаўненне яе лакун. Апошняя акалічнасць, між іншым, тлумачыць большы, чым прынята звычайна, памер гэтай рэцэнзіі.

Кар'еру навукоўца Г. Шкляр пачынаў як ідышыст. Спачатку ён займаўся дыялекталогіяй, вынікам чаго стала публікацыя ў 1932 г. працы «Дыялекталагічныя даследаванні ідыш у Савецкім Саюзе» (у рэцэнзаваным зборніку фігуруе ў двух варыянтах: «Дыялекталогія ідыш» і «Дыялекталагічныя даследаванні за 15 гадоў»). Несумненную каштоўнасць уяўляе артыкул Г. Шкляра 1933 г. «Ідыш-беларускія моўныя паралелі» (у зборніку фігуруе як «Беларуска-яўрэйскія моўныя паралелі»). На працягу 1932–1936 гг. у Беларускай акадэміі навук ішла падрыхтоўка «Тлумачальнага слоўніка ідыш», у якой удзельнічаў Г. Шкляр. У 1934–1936 гг. герой кнігі надрукаваў некалькі артыкулаў, прысвечаных актуальным праблемам распрацоўкі ідыш: «Савецкія неалагізмы ў мове» (дакладная назва: «Савецкія неалагізмы ў ідыш», 1934), «Развіццё рэвалюцыйнай лексікі» (дакладная назва: «Развіццё рэвалюцыйнай лексікі ў ідыш», 1935) і інш.

На жаль, ідышыстычны профіль Г. Шкляра ў зборніку адлюстраваны мімаходзь. Артыкулы лінгвіста ў галіне ідыш не пералічаны ў кнізе ў адным месцы. У прадмове спачатку ў падстаронкавай заўвазе названы два артыкулы, потым у іншым месцы, пасля інфармацыі пра падручнікі па беларускай мове 1939–1940 гг., гаворыцца пра «некалькі досыць аб'ёмных артыкулаў», апублікаваных Г. Шклярам у Мінску ў часопісе «Лінгвістычны зборнік». Аднак публікацыі ў «Лінгвістычным зборніку» (варта было ўдакладніць, што тут мелася на ўвазе ідышамоўнае выданне «Lingvistishe zamlung») былі здзейснены ў 1933–1934 гг., яны папярэднічалі выданню падручнікаў. Акрамя таго, у Г. Шкляра былі і артыкулы, надрукаваныя па-за рамкамі «Лінгвістычнага зборніка», напрыклад у бюлетэні Інстытута яўрэйскай пралетарскай культуры Беларускай акадэміі навук «На навуковым фронце» («Afn visnshaftlekhn front»). Скарочаны і адрэдагаваны спіс публікацый Г. Шкляра ў галіне ідыш 1932–1936 гг. можна знайсці ў «кастрамской» частцы рэцэнзаванага зборніка. Гэты спіс быў падрыхтаваны Г. Шклярам па-за цэнтрам вывучэння ідыш, якім з'яўляўся Мінск, у час, калі даследаванне ідыш у Савецкім Саюзе прыпынілася. У спісе ў назвах артыкулаў ні разу не згадваецца слова «ідыш», няма артыкула пра барацьбу з «нацдэмізмам», які згадваецца ў прадмове да зборніка, абмінуты артыкул 1934 г. «Аб перакладах на ідыш класікаў марксізму-ленінізму».

Працы Г. Шкляра ў галіне ідыш 1932–1936 гг. варта было згадаць у першую чаргу. У ідышыстыку ў 1930 г. Г. Шкляр прыйшоў пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Згодна са сведчаннямі С. Рохкінд, яшчэ ў студэнцкія гады герой кнігі ўдзельнічаў у зборы матэрыялаў для атласа ідыш. Удзел Г. Шкляра ў 1932–1935 гг. у падрыхтоўцы такой важнай працы, як «Тлумачальны слоўнік ідыш», несумненна, спрыяў засваенню маладым лінгвістам як навыкаў вядзення лексікаграфічнай работы, так і тагачасных ведаў у галіне «класавай барацьбы ў мове ідыш». Між іншым, «класавая барацьба

[2]*Шевелев Д.* Еврейские исследования в Белорусской ССР в 1933–1941 гг. (по документам Центрального научного архива Национальной академии наук Беларуси) // Материалы Шестнадцат. ежегод. Междунар. междисциплин. конф. по иудаике. М., 2009. Ч. 2. С. 487.

ў мове ідыш» – гэта не публіцыстычны пасаж, а назва надрукаванага ў 1934 г. у другім выпуску «Лінгвістычнага зборніка» артыкула А. Валабрынскага; у беларусістыцы такія артыкулы былі асабліва папулярныя ў 1931 г. У даследаванне беларускай мовы Г. Шкляр быў рэкрутаваны пасля некалькіх гадоў работы ў ідышыстыцы. Гэта адбылося ў экстрэмальнай сітуацыі, калі заданне напісаць падручнікі па беларускай мове немагчыма было забяспечыць дастатковай колькасцю кваліфікаваных беларусістаў. У адной з аўтабіяграфій Г. Шкляр згадваў сваю работу ў складзе навуковых «брыгад» – такія калектывы фарміраваліся ў 1930-я гг. для выканання адказных і тэрміновых заданняў, калі трэба было ліквідаваць нейкія «прарывы». З'яўляючыся «вылучэнцам» у беларусістыцы, ён, аднак, не быў навічком у мовазнаўстве і паказаў сябе ў гэтай галіне лінгвістыкі ў 1939–1940 гг. належным чынам. У 1939 г. Г. Шкляр не толькі паўдзельнічаў у напісанні падручніка па сінтаксісу беларускай мовы, але і выступіў у ролі аднаго з рэдактараў гэтай кнігі. К 1941 г. у Інстытуце мовы і літаратуры АН БССР Г. Шкляр зрабіў добрую кар'еру. Ён кіраваў падрыхтоўкай беларуска-рускага слоўніка, распрацоўваў тэму «шкодных паланізмаў» у беларускай мове і разам з К. Гурскім і Ц. Ломцевым займаўся пытаннямі беларускага правапісу.

З аднаго боку, публікацыі Г. Шкляра па ідыш 1932–1936 гг. варта аддзяляць ад яго беларусістычных публікацый 1939–1940 гг. З другога боку, паколькі ў сферы *corpus planning* у галіне лексікі перад лінгвістамі-беларусістамі і мовазнаўцамі-ідышыстамі ў гэты час стаялі ў значнай ступені падобныя задачы, звязаныя з патрэбай інстытуцыялізаванай саветызацыі мовы, некаторыя аспекты працы Г. Шкляра па беларускай мове можна разглядаць у сувязі з яго даследаваннямі ў галіне ідыш. Калі гаворка ідзе пра верагодны ўплыў ведаў, здабытых падчас работы з ідыш, на даследаванні аб беларускай лексіцы, то можна звярнуць увагу на тое, што да напісання раздзела пра «савецкія» наватворы ў беларускай мове ў падручніку 1940 г. у Г. Шкляра быў вопыт напісання артыкула пра такія ж наватворы ў ідыш. Прынцыпы ўкладання, прынамсі, некаторых слаёў вакабуляра «Ідыш-рускага слоўніка» 1940 г. маглі ў той ці іншай ступені ўплываць на прынцыпы фарміравання падобнай лексікі ў беларуска-рускім слоўніку, які Г. Шкляр разам з С. Рохкінд рыхтаваў у гэты ж час. У прадмове да «Ідыш-рускага слоўніка» было напісана, што «словы, якія адлюстроўваюць старыя дарэвалюцыйныя ўмовы, даюцца ў слоўніку ў мінімальнай колькасці... Зведзены да мінімуму таксама словы, якія паходзяць з рэлігійнай сферы»[3]. У той жа час у прадмове сцвярджалася, што ўкладальнікі палічылі немагчымым выключыць такія словы ўвогуле: «Па-першае, гэтыя словы частыя ў дарэвалюцыйнай літаратуры на ідышы. Па-другое, многія з іх ужываюцца нават цяпер з мэтай антырэлігійнай прапаганды. Па-трэцяе, многія такія словы часта ўжываюцца ў іранічным сэнсе. Таму мы ўключылі некаторыя словы такога тыпу ў наш слоўнік, указаўшы ў дужках, што яны рэлігійныя або ўжываюцца ў іранічным сэнсе»[4]. З дадзеных цытат добра відаць манеўраванне, да якога мусілі сягаць лінгвісты-прэскрыптывісты ў Савецкім Саюзе ў 1930-я гг. З аднаго боку, стваральнікі ідыш-рускага слоўніка павінны былі дэклараваць прыхільнасць да панаваўшых у той час ідэалагізаваных правіл укладання лексіконаў розных моў; з другога – яны не маглі дазволіць сабе цалкам «зламаць» «даручаную» ім мову.

Міжволі ўстаноўленая ў зборніку «сцяна» паміж публікацыямі Г. Шкляра ў галінах ідыш і беларускай мовы ўспрымаецца як недарэчная. Як прычына мітрэнгаў Г. Шкляра канца 1930-х гг. указана «барацьба з нацдэмаўшчынай» (маецца на ўвазе: з беларускай «нацдэмаўшчынай»), адной з ахвяр якой ён нібыта быў. З гэтай нагоды сцвярджаецца, што тэма дысертацыі Г. Шкляра пра мову Літоўскага статута «не надта супадала з галоўнымі палітычна-ідэалагічнымі задачамі перыяду» (с. 7). Але ўсё ж у нейкай меры супадала, бо ў 1939–1940 гг. у Беларусі проста нельга было збірацца абараніць дысертацыю, якая не адпавядала б тэндэнцыям свайго часу. Разам з тым побач з крытычнымі закідамі на адрас барацьбы з беларускімі нацыяналістамі ў зборніку ў нейтральным кантэксце згадваецца ідышыстычны артыкул Г. Шкляра 1934 г. «Супраць нацдэмаўшчыны ў савецкім моўным будаўніцтве», у якім лінгвіст сам змагаўся з нацыяналістамі, яўрэйскімі. На жаль, у 1930-я гг. немагчыма было заставацца «бяспрымеснымі» героямі, у жыцці навукоўцаў гэтага часу бывала рознае…

Адносна такой вядомай крыніцы 1931 г., як «Моўны атлас ідыш у Савецкім Саюзе» («Yidisher shprakhatlas fun Sovetn-farband», яго назва дадзена ў кнізе на рускай мове), не ўказаны аўтар, месца выдання і зроблена збыткоўная агаворка, што атлас, магчыма, быў надрукаваны ў 1929 г. Тут, відаць, наклалася інфармацыя пра тое, што ў 1929 г. у Мінску ж была апублікавана папярэдняя брашура для падрыхтоўкі атласа.

Рыхтуючы том, рэдактары карысталіся рэсурсамі інтэрнета, але, на жаль, толькі руска- і беларускамоўнымі. Напрыклад, англамоўныя крыніцы сярод іншага могуць указаць на тое, што герой кнігі

[3]Цыт. пав.: *Noble S.* Yiddish lexicography // Jewish Book Annual. 1961–1962. Vol. 19. P. 21.
[4]Тамсама.

ўдзельнічаў у канферэнцыі аб мове ідыш у Кіеве ў маі 1934 г.[5]

У кнізе рэдактарам штораз даводзіцца разважаць аб працах 1930-х гг., публікацыі якіх не здзейсніліся. Падрыхтоўка такіх прац, звычайна калектыўных, планавалася ў навуковых установах. Аб працэсе работы над іншымі даследаваннямі ці нават аб іх выкананні часам ведаем са сведчанняў самога Г. Шкляра. Калі гаворка ідзе пра неапублікаваныя працы, то варта адрозніваць тры віды інфармацыі пра іх: сведчанні аб іх планаванні, звесткі аб ходзе работы над імі і паведамленні аб іх паспяховым завяршэнні. З аднаго боку, у працах па гісторыі навукі з'яўляецца карэктным указваць на любыя віды інфармацыі пра нейкія, зробленыя або нязробленыя, работы: гэта можа спрыяць прыцягненню ўвагі і ў выніку садзейнічаць наступнаму адшуканню канкрэтных раней невядомых прац. З другога боку, стараннае «вышыванне ўзораў» на (часам мінімальнай) інфармацыі пра тое, што падрыхтоўка нейкіх прац задумвалася і планавалася, можа быць плёнам фантазіі апантаных даследчыкаў і заводзіць далёка ад рэальнасці.

У любым выпадку развагі пра такога роду працы патрабуюць асаблівай акуратнасці ў ацэнках, пазітыўных ці негатыўных. З нагоды рыхтаванага ў 1932–1936 гг. «Тлумачальнага слоўніка ідыш» у рэцэнзаваным зборніку паведамляецца, што навукоўцы «не здолелі стварыць слоўнік хоць бы ў яго рукапісным выглядзе» (с. 17). Паколькі пра акалічнасці падрыхтоўкі гэтай працы вядома мала і звычайнымі ў Беларусі ў 1930-я гг. былі спецыфічны (неспрыяльны для лінгвістыкі) ідэалагічна-палітычны кантэкст і кадравая нестабільнасць, то пры ацэнцы вынікаў гэтай дзейнасці пажаданыя больш «літасцівыя» канатацыі. Тым больш што, згодна з некаторымі крыніцамі, надзейнасць якіх, аднак, патрабуе праверкі, пад рэдакцыяй кіраўніка тэмы «Тлумачальны слоўнік ідыш» Х. Гальмштока ў Мінску ў 1935 г. усё ж быў выдадзены пробны выпуск «Слоўніка ідыш» («Yidisher verterbukh»)[6].

В. Курцова сцвярджае, што ў дачыненні да папярэдніх прац у галіне ідыш запланаваная для Г. Шкляра ў 1936 г. праца пра лексічны склад ідыш XVII–XVIII стст. на тэрыторыі Польшчы і Беларусі была б «абагульняльнай», у ёй, маўляў, навуковец збіраўся даследаваць «унутрысістэмныя моўныя сувязі і словаўтваральныя магчымасці…» ці то семантычных багаццяў, ці то карт лінгвагеаграфічнага атласа (с. 18–19). З нагоды дыялекталагічнага атласа 1931 г., артыкула Г. Шкляра 1933 г., нязробленых «Тлумачальнага слоўніка ідыш» і працы па гісторыі лексікі XVII–XVIII стст. у кнізе напісана як пра «буйны комплекс навукова-даследчых прац, у якім было б зроблена поліструктурнае апісанне яўрэйскай мовы ідыш» (с. 18).

Але дасягненні беларускай ідышыстыкі лепш ацэньваць на аснове рэалізаваных праектаў. Калі ідзе размова аб запланаванай для Г. Шкляра працы пра лексічны склад ідыш у яго гістарычным разрэзе, то, акрамя запісанай у планы назвы тэмы, пра яе нічога невядома. Дыскурс «мова як сістэма» ў 1930-я гг. яшчэ толькі зараджаўся, меў літаральна падлеткавы ўзрост. Бадай, няма падстаў думаць, што ў выкананай у гэты час працы па гісторыі лексікі (лексіка, асабліва гістарычная, сама па сабе нярэдка бывае «несістэмнай») мелі быць вывучаны «ўнутрысістэмныя сувязі».

Можна пашкадаваць, што пры перадруку даследаванняў Г. Шкляра мінскага перыяду ўкладальнікі абмежаваліся толькі працамі 1939 і 1940 гг. У зборніку магло б быць дарэчы як мінімум узнаўленне артыкула 1933 г. «Ідыш-беларускія моўныя паралелі».

Асобнай увагі заслугоўвае гісторыя падрыхтоўкі ў АН БССР у канцы 1930-х – пачатку 1940-х гг. беларуска-рускага слоўніка. В. Курцова называе акалічнасці яго ўкладання «цьмянай слоўнікавай справай, якая ахутана да канца незразумелай сакрэтнасцю», «лексікаграфічнай таямніцай 1930-х гадоў» (с. 8, 10) і ўносіць у яе даследаванне важныя акцэнты. Па-першае, устаноўлены шэраг акалічнасцей падрыхтоўкі ў 1940–1942 гг. беларуска-рускага слоўніка. Сцвярджаецца, што такі слоўнік не выйшаў з-за пачатку вайны (с. 8). Г. Шкляр браў удзел у падрыхтоўцы беларуска-рускага слоўніка ў 1940–1942 гг., у 1940–1941 гг. укладаў слоўнік разам з С. Рохкінд, ён жа і кіраваў праектам. Рэдактарамі слоўніка мелі быць К. Крапіва і М. Лынькоў (с. 8, 25). У 1942 г. укладанне беларуска-рускага слоўніка ў АН БССР нібыта было прадоўжана. Па-другое, сцвярджаецца, што распрацоўка беларуска-рускага слоўніка ў 1930-я гг. для АН БССР была быццам больш важнай задачай, чым укладанне руска-беларускага слоўніка (с. 8). Гэтыя меркаванні вартыя глыбейшага асэнсавання.

Бадай, трэба адрозніваць інфармацыю аб складзеных кіраўнікамі навуковых інстытуцый планах-намерах ад звестак аб правядзенні канкрэтнай работы.

Калі меркаваць па прыведзеных у кнізе дакументах, то падрыхтоўка ў 1940–1941 гг. беларуска-рускага слоўніка пацвярджаецца двума дакументамі-планамі, а таксама той акалічнасцю, што

[5] Гл.: *Cohen B.* B. H. Shklyar [Electronic resource] // Yiddish Leksikon. URL: http://yleksikon.blogspot.com/2019/11/h-shklyar.html (date of access: 05.03.2021).

[6] Напрыклад: Khayim Holmshtok [Electronic resource] // Yiddish Leksikon. URL: http://yleksikon.blogspot.com/2015/12/khayim-holmshtok.html (date of access: 05.03.2021).

пасля вайны Г. Шкляр сам спасылаўся на такую сваю работу. Публікацый з перыёдыкі або іншых мемуарных крыніц, якія пацвярджалі б гэты факт, здаецца, няма. У запісаных у сярэдзіне 1990-х гг. успамінах С. Рохкінд сказана, што пасля 1937 г. яна разам з Г. Шклярам займалася падрыхтоўкай ідышрускага слоўніка і ўключылася ў беларусістыку: «Нас прымацавалі да беларускага Інстытута літаратуры і мовы і адразу ж даручылі ўкладаць беларускую граматыку для вышэйшых школ»[7]. Работу над беларуска-рускім слоўнікам С. Рохкінд не згадала. У напісанай у канцы 1950-х гг. аўтабіяграфіі адзін з верагодных рэдактараў гэтага слоўніка К. Крапіва згадваў свой удзел перад вайной у рэдагаванні руска-беларускага слоўніка, але беларуска-рускі слоўнік таксама не называў.

З увагі на тое, што ў 1930-я гг. ад кіраўніцтва акадэмічных устаноў штораз вымагаліся задакументаваныя планы, яны, згодна са словамі паэта, мелі дэманстраваць «громадье». Трэба разумець, што некаторыя напісаныя ў гэты час планы былі хутчэй дэкларацыямі аб намерах, чым рэальнымі праектамі. Вядома пра кадравы голад у беларускай лексікаграфіі 1930-х – пачатку 1940-х гг. Пра недахоп кадраў у справе падрыхтоўкі беларускарускага слоўніка ў 1940 г. сведчыць тое, што для яго напісання былі прызначаны людзі, якія не мелі ранейшага вопыту беларусістычнай дзейнасці: Г. Шкляр і С. Рохкінд. На кадравыя праблемы ўказвала і тая акалічнасць, што пасада трэцяй асобы, малодшага навуковага супрацоўніка, запланаванага для ўдзелу ў падрыхтоўцы слоўніка, заставалася вакантнай. Указанне на гэту вакансію тым больш важнае, што, згодна з планам, картатэка слоўніка мела папоўніцца на 50 тыс. картак. Хто павінен быў выконваць такую работу? Варта заўважыць, што ў двух дакументах-планах фігуруе неаднолькавы памер планаванага слоўніка ці яго частак: 70 тыс. (с. 21) і 20 тыс. (с. 25) слоў. Здаецца, планаваны спачатку памер слоўніка пазней быў скарэкціраваны ў бок змяншэння – такая акалічнасць сведчыла пра тое, што з цягам часу ў планаванні лексікаграфічнай работы з’яўлялася больш рэалізму.

У любым выпадку можна меркаваць, што работа над беларуска-рускім слоўнікам у 1940–1941 гг. прасунулася недалёка. У зборніку, аднак, робіцца дапушчэнне, што Г. Шкляр быў сярод тых, хто «трымаў у руках фрагменты або, магчыма, і гатовы рукапіс аднатомнай лексікаграфічнай працы» (с. 9). Паколькі амаль няма ніякай інфармацыі аб працяканні работы над слоўнікам, то можна хіба толькі выказваць – больш ці менш пэўныя або няпэўныя – здагадкі. Здагадка аб «гатовым рукапісе» вельмі няпэўная.

Аналагічна, складана высветліць, ці займаліся беларуска-рускім слоўнікам у АН БССР у 1942 г. Калі меркаваць па датаваным красавіком 1942 г. артыкуле тагачаснага прэзідэнта АН БССР К. Горава, то мовазнаўчыя даследаванні ў гэты час у акадэміі не праводзіліся (але ў артыкуле згадвалася, напрыклад, «распрацоўка пытанняў гісторыі, літаратуры»)[8]. Намер падрыхтаваць такі слоўнік у 1942 г., аднак, пацвярджаецца акадэмічным загадам ад 7 ліпеня 1942 г. З нагоды падрыхтоўкі на другім годзе вайны беларуска-рускага слоўніка ў кнізе можна знайсці процілеглыя выказванні. У зборніку то сцвярджаецца, што ўпарадкаваннем і сістэматызацыяй слоўнікавых матэрыялаў пасля выезду з Мінска Г. Шкляр займаўся «асабіста» (с. 25), то дапускаецца, што падчас знаходжання ў Кастраме беларуска-рускім слоўнікам герой кнігі «наогул не займаўся» (с. 26). Таксама ў кнізе выказаны здагадкі, што Г. Шкляр да пачатку 1943 г., магчыма, уклаў беларуска-рускі слоўнік (с. 26).

Завяршэнне ў 1942 г. працы над слоўнікам стала б магчымым у тым выпадку, калі б ён у значнай ступені быў падрыхтаваны да чэрвеня 1941 г. і яго рукапіс Г. Шкляр вывез з сабой у эвакуацыю. Ні пра першае, ні пра другое ніякай інфармацыі няма.

Уласна пра падрыхтоўку ў 1940–1942 гг. беларуска-рускага слоўніка ёсць прыблізна столькі ж інфармацыі, колькі вядома пра падрыхтоўку ў 1932–1936 гг. «Тлумачальнага слоўніка ідыш», – вельмі мала. Тым не менш адносна першага слоўніка ў кнізе знаходзім строгі прысуд (навукоўцы «не здолелі стварыць слоўнік хоць бы ў рукапісе»), а ў дачыненні да другога – велікадушныя здагадкі пра «гатовы рукапіс».

Пасля 7 ліпеня 1942 г., калі запіс аб падрыхтоўцы беларуска-рускага слоўніка быў унесены ў план работы, прыкметы таго, што гэтай працай у АН БССР займаліся, на пару гадоў губляюцца. Пра слоўнік не было ўпамінання на сесіі АН БССР 29 лістапада – 1 снежня 1942 г. У пачатку 1943 г. Г. Шкляр даслаў у акадэмію выкананую ім працу «Паходжанне і лексічны склад беларускай мовы», а таксама план распрацоўкі тэмы «Янка Купала ў гісторыі беларускай мовы». Паколькі пацвярджэння аб атрыманні з прэзідыума АН БССР не было, у маі 1943 г. Г. Шкляр паслаў яшчэ адзін ліст, адрасаваўшы яго Я. Коласу. Работа над слоўнікам у лісце не згадвалася. Немагчыма ўявіць, каб у лісце з элементамі справаздачы кіраўніцтву ўстановы нейкі супрацоўнік ні слова не напісаў пра выкананне ўскладзенага на яго задання. Гэта вымушае думаць, што зафіксаванае ў дакументах 7 ліпеня 1942 г., ва ўмовах нягодаў ваеннага часу, заданне

[7]Шпринца (Софья) Рохкинд. Три города в моей жизни [Электронный ресурс]. URL: https://belisrael.info/?p=7959 (дата обращения: 05.03.2021). (Пераклад наш. – *С. З.*)
[8]*Гораў К. В.* Працы беларускіх вучоных // Савецкая Беларусь. 1942. 17 крас. (№ 38).

займацца беларуска-рускім слоўнікам было плёнам актыўнасці «навуковай бюракратыі».

Відаць, заданне падрыхтаваць слоўнік у 1942 г. было сфармулявана спантанна, «па інерцыі» і неўзабаве забылася. Такога роду збоі ў планаванні навуковых даследаванняў у 1942–1943 гг. маглі здарацца. Напрыклад, вядома, што 2 лютага 1943 г. бюро ЦК КПБ адхіліла распрацаваны план работы АН БССР на 1943 г.[9]

Што да меркавання пра большую важнасць беларуска-рускага слоўніка ў параўнанні з руска-беларускім, то яно выказана В. Курцовай у працяг асэнсавання інфармацыі аб падрыхтоўцы ў АН БССР у 1940–1942 гг. беларуска-рускага слоўніка. Такая думка вылучана ў працэсе аспрэчвання меркавання пра тое, што, маўляў, на працягу 1930-х – пачатку 1940-х гг. у Акадэміі навук БССР «не мог быць падрыхтаваны» беларуска-рускі слоўнік, бо ў 1932–1937 гг. і пазней навукоўцы займаліся руска-беларускім слоўнікам (с. 8). Дадзеная ў рэцэнзаваным зборніку спасылка на літаратуру не дазваляе ўстанавіць, каму належыць думка пра немагчымасць падрыхтоўкі ў АН БССР беларуска-рускага слоўніка. Тым не менш гэтае меркаванне ў зборніку старанна абвяргаецца. На важнасць падрыхтоўкі ў акадэміі ў 1940–1942 гг. беларуска-рускага слоўніка на адной старонцы з выкарыстаннем эмфатычных слоў «менавіта» і «якраз» указваецца чатыры разы (с. 8).

Але калі з нагоды падрыхтоўкі ў 1931–1938 гг. руска-беларускага слоўніка існуе каля 30 разнастайных сведчанняў, то пра падрыхтоўку ў 1940–1942 гг. беларуска-рускага слоўніка ведаем толькі з чатырох крыніц, дзве з якіх – планы, а яшчэ адна – загад (можна сказаць, таксама план). Сярод далучаных да працэсу мемуарыстаў толькі Г. Шкляр памятаў пра выкананне такой работы, а К. Крапіва і С. Рохкінд на яе не ўказалі. Не захавалася ніводнага артыкула гэтага слоўніка. Бадай, можна дапусціць, што, навучаныя гісторыяй перманентна «няўдалай» падрыхтоўкі на працягу 1932–1938 гг. руска-беларускіх слоўнікаў, к канцу 1930-х гг. кіраўнікі Інстытута мовы АН БССР проста вырашылі на нейкі час пераключыцца на беларуска-рускі слоўнік як больш «бяспечную» работу. Ён не меў за сабой такога доўгага шлейфу няўдач, як гэта было з руска-беларускім слоўнікам, значыць, ім магло менш цікавіцца высокае начальства. Не гаворачы пра тое, што існаванне адных прыярытэтаў, напрыклад, для 1940–1942 гг. зусім не павінна было б адмаўляць наяўнасці іншых прыярытэтаў для 1931–1937 гг.

Сярод неапублікаваных прац Г. Шкляра звяртае на сябе ўвагу планаваны для друку ў зборніку АН БССР 1941 г. артыкул «Я. Колас у гісторыі беларускай мовы» (пяць друкаваных аркушаў). Якім мог быць лёс гэтага рукапісу? Ён «проста» не захаваўся? Калі мець на ўвазе тое, што сярод дадаткаў працы Г. Шкляра 1953 г. быў і дадатак, датычны мовы аповесці Я. Коласа «Дрыгва», то можна думаць, што ў Кастраме Г. Шкляр паспрабаваў неяк аднавіць частку сваёй ранейшай працы пра пісьменніка.

Увогуле, інтрыгуе тое, што, нягледзячы на няўдачу з абаронай дысертацыі ў канцы 1940-х гг., аж да 1960 г. (дата публікацыі пра клічную форму ў беларускай мове) Г. Шкляр займаўся ў Кастраме беларусістыкай. У звароце Кастрамскога настаўніцкага інстытута ў Камітэт па справах вышэйшай школы ў Маскву ад 30 кастрычніка 1945 г. сцвярджаецца, што ў Г. Шкляра ў гэты час была наладжана сувязь з АН БССР, што, знаходзячыся ў Кастраме, ён неаднаразова выконваў яе заданні. На жаль, невядома, якія. Няма таксама ніякай пацверджанай інфармацыі пра яго кантакты з АН БССР пасля 1943 г.

У 1941 г. у Мінску Г. Шкляр прадставіў да абароны дысертацыю пра мову Літоўскага статута. Звяртае на сябе ўвагу тое, што гэта была праца гістарычнага характару, як, дарэчы, і некаторыя іншыя (неапублікаваныя) даследаванні Г. Шкляра канца 1930-х – пачатку 1940-х гг.: «Слоўнік Л. Зізанія як помнік беларускай мовы XVI стагоддзя», «Я. Колас у гісторыі беларускай мовы». У першым абзацы напісанага Г. Шклярам раздзела «Лексіка» падручніка 1940 г. згадваюцца *Літоўскі летапіс* і *Літоўскі статут*. Немагчыма такое ўявіць у 1932–1936 гг. Здаецца, што к канцу 1930-х гг. ранейшая фактычная забарона на гістарычныя даследаванні была знята.

Застаюцца не зусім зразумелымі прычыны неабароны Г. Шклярам дысертацыі ў Кастраме. Станоўчы водзыў на дысертацыю 3 лютага 1948 г. даў прафесар А. Міртаў. Як пра прычыну неабароны Н. Ганцоўская напісала пра «сур'ёзную хваробу і жыццёвыя перыпетыі» (с. 34). Праўда, у ранейшай (сумеснай з У. Смарчковым) публікацыі 2015 г. прычынай быў названы выхад у свет працы І. В. Сталіна, які «разграміў марызм»[10]. Але, відавочна, кастрамскія аўтары не хацелі сказаць, што дысертацыя Г. Шкляра была марысцкай. Водзыў А. Міртава быў зроблены за два гады да з'яўлення твораў І. В. Сталіна, і за гэты час, здавалася б, можна было б абараніць дысертацыю... Святло на акалічнасці няўдалай спробы абараніць дысертацыю ў канцы 1940-х гг. можа быць праліта ў частцы, напісанай беларускім рэдактарам тома. В. Курцова паведамляе, што ў сакавіку 1949 г. імя Г. Шкляра ў неспрыяльным кантэксце фігуравала на пасяджэнні калегіі Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР у Маскве, дзе герой кнігі быў

[9]Национальная академия наук Беларуси. Историко-документальная летопись. Минск : Беларус. навука, 2008. С. 66–67.

[10]*Ганцовская Н. С., Сморчков В. К.* У истоков систематического изучения костромских говоров: Герцель Залманович Шкляр // Вторые Громовские чтения. Русские народные говоры: прошлое и настоящее. Кострома, 2015. С. 124.

згаданы як адзін з суаўтараў «пабудаванага на касмапалітычнай аснове» падручніка 1940 г. «Курс сучаснай беларускай мовы» (с. 6–7). З гэтай жа нагоды В. Курцова напісала, што пасля дадзенага эпізода «апераджальная» рэакцыя кастрамскога кіраўніцтва «не прымусіла сябе чакаць» (с. 7). Відавочна, такую інтэрпрэтацыю кастрамскіх падзей больш адпаведна было б прачытаць у «кастрамскім» раздзеле кнігі.

Як можа вынікаць з апублікаваных выпісак з асабовай справы, Г. Шкляр рабіў і трэцюю спробу абараніць дысертацыю: 26 красавіка 1954 г. у Кастраме ў сувязі з планаванай абаронай дысертацыі ў Інстытуце мовазнаўства (відаць, маецца на ўвазе маскоўская акадэмічная ўстанова) яму была выдадзена характарыстыка.

Змешчаныя ў рэцэнзаваным выданні працы Г. Шкляра надрукаваны з мінімальнымі каментарыямі, якія фактычна зводзяцца да ўказанняў, што тая або іншая прыведзеная навукоўцам з'ява не адпавядае нормам сучаснай беларускай мовы. Увагу беларусістаў, верагодна, у першую чаргу можа прыцягнуць датаваны 1953 г. рукапіс раней невядомага даследавання «Беларуска-польскія слоўнікавыя адносіны (да пытання аб моўнай роднасці славянскіх нацый)». Паводле Н. Ганцоўскай, праца і сёння ўяўляе вялікі навуковы інтарэс і можа быць карыснай «як у тэарэтычна-метадалагічных, так і ў практычных адносінах» (с.218). Выглядае, што праца з'яўляецца пэўным вынікам асэнсавання тэмы беларуска-польскіх лексічных адносін на працягу больш чым дзесяці гадоў. Ужо ў падручніку 1940 г. можна бачыць некаторыя ідэі, якія пазней Г. Шкляр распрацоўваў і пашыраў. Прамежкавымі этапамі можна лічыць рукапіс працы 1942 г. і дысертацыю канца 1940-х гг. Пры параўнанні публікацыі 1940 г. з «паслямараўскім» рукапісам 1953 г. заўважаюцца толькі пэўныя карэктывы раней напісанага, развіццё ранейшых поглядаў, але не выяўляюцца выразныя «адрачэнні». Гэта сведчыць аб ухвальнай адданасці Г. Шкляра навуковаму падыходу, на які мала ўплывала ідэалагічна-палітычная кан'юнктура. Цікава, што, пішучы сваю беларусістычную працу ў Кастраме ў пачатку 1950-х гг., Г. Шкляр мог спасылацца на працы асобных рэпрэсаваных беларускіх лінгвістаў 1920-х гг. (напрыклад, І. Ваўка-Левановіча), што было немагчыма ў гэты час у Мінску.

Што да ўзнаўлення ў зборніку раней друкаваных прац, то сучаснае прачытанне раздзела пра лексіку падручніка 1940 г. змушае звярнуць увагу на тое, што нечакана ў ім адносна мала ідэалагізацыі і амаль незаўважныя сляды марызму. Падручнік выкарыстоўваўся ў вышэйшай школе мінімум да 1949 г. Насуперак таму, што Г. Шкляру ў АН БССР прадпісвалася займацца «шкоднымі паланізмамі» і спосабамі барацьбы з імі, тэма патрэбы ачышчэння беларускай мовы ад паланізмаў у працы 1940 г. выкладзена вельмі сцісла. Будучы сведкам бурных грамадскі дыскусій 1930-х гг., у якіх слова «паланізм» часта ўжывалася ў ідэалагічна напружаных кантэкстах і магло пераўтварацца ў своеасаблівы палітычны ярлык, у падручніку 1940 г. Г. Шкляр супрацьпаставіў неўтаймоўнай ідэалагізацыі ранейшага часу падыход, які грунтаваўся на знешне вельмі акадэмічных поглядах Я. Карскага. Згодна з ім, паланізмаў у беларускай мове было зусім няшмат; значыць, у гэтым было імпліцытнае пасланне: пры іх трактоўцы не варта распаляць абстаноўку[11]. У нейтралізацыі запазычанняў з польскай мовы ў рукапісе 1953 г. Г. Шкляр пайшоў яшчэ далей, вылучыўшы спецыяльны разрад *уяўных паланізмаў*. Выглядае, што ў выніку адна крайнасць (выразны і неўтаймоўны акцэнт на паланізмах у першай палове 1930-х гг.) была заменена іншай – абмежаваннем іх толькі словамі, якія мелі апазнавальныя рысы запазычанняў з польскай мовы. Такі ход дазваляў істотна змяншаць уплыў польскай мовы на беларускую і фактычна «выбіваў глебу» з-пад ног тых аўтараў, якія голасна ўказвалі на неабгрунтаванае «засілле» паланізмаў у беларускай мове. Адваротным – і на гэты раз адмоўным – бокам такой ініцыятывы было тое, што з-пад разгляду выводзілася вялікая колькасць паланізмаў, якія апазнавальных рысаў польскай мовы не маюць.

Параўнальна з працамі мовазнаўцаў 1920-х гг. лексічны раздзел падручніка 1940 г. вылучаецца тым, што ў ім у цэлым больш паслядоўна выкарыстаны распрацоўкі пра запазычанні беларускай мовы Я. Карскага. Матэрыял у раздзеле часта выкладзены з незвычайнай для падручнікаў падрабязнасцю. У раздзеле выкарыстаны прыёмы лексічнай тыпалогіі, прысутнічае вельмі моцны супастаўляльны беларуска-рускі ракурс, у тым ліку закладзены пачатак вывучэння калек з рускай мовы, тэмы міжмоўных беларуска-рускіх амонімаў і паронімаў. Магчыма, вялікая ўвага да беларуска-рускіх параўнанняў у раздзеле з'яўлялася ў тым ліку пэўнай рэакцыяй на тую акалічнасць, што ў 1939 г. у БДУ быў заснаваны філалагічны факультэт з двума – беларускім і рускім – аддзяленнямі. Факультэту была патрэбна свая вучэбная літаратура.

Як ужо заўважана вышэй, некаторыя аспекты разгляду Г. Шклярам беларускай лексікі ў 1940 г. карэлююць з яго ранейшымі распрацоўкамі ў галіне лексікі ідыш – да раней указанай працы пра савецкія наватворы тут можна дадаць і артыкул, у якім вывучаліся ў тым ліку ідышызмы ў беларускай мове.

[11]Пэўная нейтралізацыя гаворкі пра паланізмы была падрыхтавана некаторымі публіцыстычнымі выступленнямі ранейшага часу, напрыклад артыкулам, фактычна фельетонам, М. Лынькова «Пра некаторых Угрум-Бурчэевых... ці Прыгоды аднаго лінгвіста», апублікаваным у газеце «Літаратура і мастацтва» 11 чэрвеня 1939 г. У гэтым артыкуле аўтар у карыкатурным выглядзе падаў людзей, схільных лічыць «паланізмамі» ледзь не любое запазычанае слова ў беларускай мове.

На жаль, у рэцэнзаванай кнізе выказаны шэраг памылковых сцверджанняў, дзіўным чынам выкладаецца тая або іншая аргументацыя. Так, у прадмове гаворыцца, што ў пэўныя часы імя Г. Шкляра «знікала» з «навукова-інфармацыйных крыніц», двойчы сцвярджаецца, што беларусістычныя працы Г. Шкляра не згадваюцца нават у бібліяграфічных даведніках. Гэта не так. Як навуковец, які працаваў у беларусістыцы «па абавязку службы» толькі тры гады, як суаўтар старых падручнікаў, на змену якім прыйшлі некалькі пакаленняў новых, як чалавек, які не абараніў дысертацыі, не пакінуў па сабе ніводнай манаграфіі, не ўваходзіў у навуковую наменклатуру, Г. Шкляр і не можа быць асабліва вядомым беларусістам. Яго працы, насуперак В. Курцовай, тым не менш вядомыя спецыялістам, яны адлюстраваны ў бібліяграфічным указальніку «Беларускае мовазнаўства» 1967 г., разглядаюцца ў працы Л. Шакуна «Гісторыя беларускага мовазнаўства», выкарыстоўваюцца ў іншых крыніцах.

Пасля ўказання на тое, што ў ліпені 1942 г. Г. Шкляр быў прызначаны кіраўніком праекта беларуска-рускага слоўніка, В. Курцова разважае, чаму для гэтай работы была абрана менавіта яго кандыдатура. Перабіраюцца такія акалічнасці: з 1937 г. на АН БССР абрынуліся рэпрэсіі, кадраў не хапала, Г. Шкляр ужо кіраваў падрыхтоўкай слоўніка ў 1940–1941 гг., лінгвіста асабіста ведаў віцэ-прэзідэнт АН БССР Я. Колас, пра мову твораў якога Г. Шкляр раней напісаў навуковую працу. Дзіўна, але, здавалася б, найбольш відавочны аргумент – Г. Шкляр ужо кіраваў работай над слоўнікам раней і быў абазнаны ў гэтай справе – інтэрпрэтуецца як менш значны на фоне, як справядліва адзначана, «суб'ектыўнага пункта гледжання» беларускай рэдактаркі тома аб верагоднай пратэкцыі Г. Шкляру з боку Я. Коласа (с. 24).

Архіўныя дакументы ў рэцэнзаваным зборніку пададзены не заўсёды дакладна. Прозвішча прысутнага на пасяджэнні Прэзідыума Беларускай акадэміі навук 12 студзеня 1931 г. вучонага сакратара Інстытута мовазнаўства Я. Мацюкевіча памылкова прачытана як «Кацюкевіч». Памылкова датавана адно з пасяджэнняў Прэзідыума Беларускай акадэміі навук: замест 21 лістапада 1933 г. мае быць 21 лютага. Апублікаваныя ў зборніку выпіскі з асабовай справы Г. Шкляра не заўсёды даюць магчымасць устанавіць даты некаторых дакументаў. У кнізе не ўказаны звесткі пра месца захавання гэтай асабовай справы.

У сукупнасці публікацыя тома выбраных прац Г. Шкляра з'яўляецца важным дасягненнем у сучасным даследаванні гісторыі беларускага мовазнаўства. У зборніку рэпрэзентатыўна прадстаўлена беларусістычная і русістычная мовазнаўчая спадчына Г. Шкляра, згаданы гебраістычныя працы. Кніга будзе асабліва цікавай спецыялістам у гісторыі лінгвістыкі, лексічнай тыпалогіі, сінтаксіса, дыялекталогіі і інш.

***С. М. Запрудскі***[12]

*Семешко Л.* **Белорусский язык для китайских студентов. Элементарный уровень = 白俄罗斯语（面向中国学生）（初级）.** Минск : Изд. центр БГУ, 2021. 288 с.: ил.

*Сямешка Л.* **Беларуская мова для кітайскіх студэнтаў. Пачатковы ўзровень = 白俄罗斯语（面向中国学生）（初级）.** Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2021. 288 с.: іл.

*Semeshko L.* **Belarusian language for Chinese students. Elementary level = 白俄罗斯语（面向中国学生）（初级）.** Minsk : Belarusian State Univ. publ. center, 2021. 88 p.: il. (in Belarus.).

Навучальны дапаможнік Л. І. Сямешкі «Беларуская мова для кітайскіх студэнтаў. Пачатковы ўзровень», які выйшаў у Выдавецкім цэнтры БДУ, – гэта першае ў рэспубліцы выданне для замежных навучэнцаў, якое адпавядае агульнаеўрапейскім стандартам узроўневага навучання беларускай мове як замежнай, а дакладней, яе першаму ўзроўню (А1), пра што і сведчыць падзагаловак кнігі. Гэта свайго роду трыгер і ўзор для стварэння падобных (вельмі якасных!) дапаможнікаў па беларускай мове як замежнай у адпаведнасці з сертыфікацыйнымі ўзроўнямі.

Тое, што Лідзія Іванаўна стала тут першапраходцам, у людзей, якія працуюць у гэтай галіне, не выклікае здзіўлення, паколькі менавіта пры яе кіраванні кафедрай сучаснай беларускай мовы (1997–2001) на філалагічным факультэце БДУ, папершае, была ўведзена спецыялізацыя «Беларуская

[12]*Сергей Николаевич Запрудский* – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Сяргей Мікалаевіч Запрудскі* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Siarhiej M. Zaprudski*, PhD (philology), docent; associate professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *zaprudski@gmail.com*

CC BY NC